УДК 94(47+438)

**_С.Я. Глазырын_**
_магістр гіст. навук, старшы выкладчык каф. гісторыі і турызма_
_Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта_

# ПРАБЛЕМА ЭТНІЧНАГА СКЛАДУ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ПАЎСТАННЯ 1863 г. НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ І МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНЯЎ

_Артыкул прысвечаны вывучэнню аднаго з найбольш дыскусійных пытанняў у межах праблемы паўстання 1863 г. на тэрыторыі Беларусі – пытанню этнічнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі яго ўдзельнікаў. У артыкуле прааналізаваны погляды на праблему асноўных прадстаўнікоў розных ідэалагічных кірункаў перыяду паўстання 1863 г. Вызначаецца стаўленне да пытання этнічнай ідэнтыфікацыіі непасрэдна саміх удзельнікаў паўстання 1863 г. на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў._

## Уводзіны

Да сённяшняга часу адной з дыскусійных праблем у межах вывучэння паўстання 1863–1864 гг. застаецца праблема этнічнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацы яго ўдзельнікаў. Дыскусійны характар пазначанай праблемы выкліканы ў першую чаргу яе ідэалагізаванасцю. Па-другое, фактычная адсутнасць дакументальных крыніц, якія аб’ектыўна асвятлялі б праблему этнічнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі ўдзельнікаў паўстання на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў. У прадстаўленым артыкуле выкарыстаны найперш матэрыялы і крыніцы, выдадзеныя ў перыяд часу ад пачатку нацыянальна-вызваленчага руху ў Віцебскай і Магілёўскай губернях у 1861 г. да пачатку ўзброенага паўстання ў 1863 г., бо матэрыялы пазнейшага паходжання маюць адбітак далейшай трансфрармацыі расійскай імперскай ідэалогіі, асабліва ў часе рэакцыі пасля паўстання.

Да пачатку 1860-х гг. у адносінах да насельніцтва паўночна-заходніх губерняў Расійскай імперыі амаль канчаткова сфарміравалася вядомая аксіёма этнічнай ідэнтыфікацыі, у аснову якой быў пакладзены прынцып канфесійнай прыналежнасці: «каталік – паляк, праваслаўны – рускі». Аднак самі аўтары гэтай канцэпцыі разумелі яе спрошчаны і штучны характар, а таму давалі пэўныя каментары, якія былі больш набліжаныя да аб’ектыўнай рэальнасці. Так, адзін са стваральнікаў ідэалогіі «заходнерусізму» Каяловіч у 1863 г. пісаў: «Я понимаю под Белоруссией гораздо больше того, что обыкновенно называется этим именем (Віцебская і Магілёўская губерніі – _С.Г._), понимаю всю ту страну, где народ говорит по-белорусски т.е и часть Виленской и часть Гродненской губернии» [1, с. 23]. Такім чынам, паклаўшы за аснову этнічнай ідэнтыфікацыі не канфесійны, а моўны прынцып, ён працягвае: «Там (у Паўночна-Заходнім краі – _С.Г._) многие латиняне (каталікі – _С.Г._) шляхетского происхождения, мещане и все члены крестьянского сословия сохраняют ещё свои самородные и местные начала и не делаются от этого поляками» [1, с. 11]. Зразумела, што аўтар адносіць большасць шляхты, мяшчан і амаль усіх сялян заходніх губерняў да беларусаў, разумеючы іх моўнае і культурнае адзінства. Аднак тут жа Каяловіч робіць маленькую заўвагу, якая сведчыць аб яго прыхільнасці «заходнерусізму»: «Называю белоруссов, малоруссов вообще русскими потому, что это слово постоянно встречается в памятниках местного происхождения и сейчас все белорусы его употребляют» [1, с. 6]. Вельмі важна, што свае высновы адносна дадзенай праблемы Каяловіч падмацоўвае фактамі, якія назбіраў падчас асабістых паездак па рэгіёне. Так, у падтрымку сваіх сцвярджанняў ён піша: «В околицах по всем сведениям, какие я собрал прошлым летом, шляхта говорит по-белорусски и немалое число её православного вероисповедания …почти везде мещанское христи-

анское население городов Западной России тоже говорит по-белорусски» [1, с. 9]. Такім чынам, падсумоўваючы свае высновы, Каяловіч падзяляе населніцтва паўночна-заходніх губерняў на наступныя этнічныя групы: этнічных палякаў (мазавецкае племя), якія з'яўляюцца меншасцю, беларусаў (рускіх), велікарусаў, якія таксама з'яўляюцца меншасцю. Але сярод іх ёсць асобная група насельніцтва, якую таксама называюць палякамі. У пазначаным рэгіёне яе складала большасць буйной і сярэдняй шляхты, якая, быўшы беларусамі па паходжанні, успрыняла ў выніку пэўных палітычных працэссаў (Крэўская, Люблінская вуніі і г.д.) польскую мову і культуру і зрабілася палякамі. Такім чынам, атрымліваецца, што ў дадзены перыяд тэрмін «паляк» у дачыненні да пазначанай катэгорыі насельніцтва з'яўляецца не этнонімам, а палітонімам.

Гэтыя ж высновы пацвярджае ў сваіх працах яшчэ адзін прыхільнік ідэалогіі «заходнерусізма» – урадавы гісторык паўстання 1863 г. Васіль Ратч, які зазначае: «В Западной России число дворян коренного польского происхождения ничтожно. Однако туземные литовско-русские (літоўскія і беларускія – *С.Г.*) дворяне считают себя поляками» [2, с. 7]. Тут жа аўтар дадае, што мясцовая шляхта засвоіла адзіны для сябе прынцып ў пытаннях нацыянальнасці, які сцвярджае, што рэлігія і мова вызначаюць характар народнасці [2, с. 40]. Менавіта таму пераход у каталіцтва і засваенне польскай мовы мясцовай беларускай шляхтай азначае аўтаматычна пераход у польскую нацыянальнасць, але не ў этнічную группу палякаў. У падтрымку высновы В. Ратч прыводзіць такое выказванне прадстаўніка гэтай шляхты: «Ещё недавно, перед последним мятежом часто слышались заявления уроженцев Западной России: хотя я – православный, я – поляк до мозга костей» [2, с. 41]. Паказальна, што, ясна ўсведамляючы сваё этнічнае (беларускае) паходжанне, мясцовая шляхта лічыла сябе выключна палякамі. Падобную мадэль этнічнай самаідэнтыфікацыі засвоіла і мяцовае сялянства, лічыць В. Ратч: «У простолюдина поныне существует вкоренённое убеждение о том, что православный – русский, а латинянин – поляк» [2, с. 40]. Атрымліваецца, што ў гэты час сяляне паўночна-заходніх (беларускіх) губерняў адносілі сябе выключна альбо да рускіх, альбо да палякаў, у залежнасці ад веравызнання. Як і Каяловіч, В. Ратч таксама распрацаваў сацыяльна-этнічную класіфікацыю мясцовага насельніцтва, аналізуючы дадзеныя па Магілёўскай губерні ў 1865 г. Так, згодна з ёй, усё рыма-каталіцкае насельніцтва губерні падзялялася на памешчыкаў-каталікоў, у асяродку якіх была невялікая частка этнічных палякаў («поляков по происхождению»), астатнія ж, зразумела, былі беларусамі. Апошнія, засвоіўшы польскую мову і веру, зрабіліся палякамі, выказваючы адданасць палітычным традыцыям былой Рэчы Паспалітай. Другую групу складалі чыноўнікі, у большасці жыхары гарадоў, якія не з'яўляліся палякамі па паходжанні, але па палітычных поглядах адносіліся да «шляхетского польского общества». Да трэцяй групы В. Ратч адносіў дробную шляхту, у склад якой уваходзілі бедныя дваране, мяшчане і аднадворцы. Яны таксама ў большасці не былі этнічнымі палякамі, але з гонарам захоўвалі «предании о былых шляхетских вольностях» [3, с. 76].

Яшчэ адзін цікавы погляд на сацыяльна-этнічную карціну насельніцтва беларускіх губерняў Расійскай імперыі 1860-х гг. прапанаваў былы навучэнец Полацкага кадэцкага корпуса Дзмітры Кайгародаў. Яго звесткі з'яўляюцца вельмі карыснымі ў межах разглядаемай праблемы, таму што ён быў непасрэдным сведкам падзей паўстання 1863 г., а па-другое, падае дадзеныя па даследуемым рэгіёне – Полацку і Полацкім павеце. Так, апісваючы небяспечны для грамадства паўстанцкі элемент, Д. Кайгародаў падзяліў насельніцтва Полацка на наступныя сацыяльныя і этна-канфесіянальныя катэгорыі: тры чвэрці жыхароў горада складалі яўрэі, яшчэ адну чвэрць складалі рускія мяшчане-раскольнікі, служачы і выкладчыцкі персанал кадэцкага корпуса (тут Кайгародаў не падае звестак пра этнічны склад гэтай групы, але можна сцвярджаць, што ў большасці яе прадстаўнікі былі рускія), палякі, да якіх адносіліся збяднелыя дваране, служа-

чыя ўрадавых устаноў горада і невялікая группа беларусаў-каталікоў, якую называлі шляхтай. У павеце ж асноўную масу паўстанцкага элемента складалі памешчыкі – пераважна палякі альбо апалячаныя беларусы-каталікі [4, с. 793]. З вышэй сказанага бачна, што большасць дваран-каталікоў жыхароў Полацка, таксама як і памешчыкаў-каталікоў, былі этнічнымі беларусамі і толькі па палітычных поглядах маглі называцца палякамі, што пацвярджае дзве папярэднія канцэпцыі.

Падсумоўваючы вышэй пералічанныя высновы па праблеме этнічнай ідэнтыфікацыі насельніцтва беларускіх губерняў (у тым ліку Віцебскай і Магілёўскай) з боку ўрадавых назіральнікаў, хацелася б прывесці цікавыя звесткі з неапублікаваных архіўных урадавых статыстычных крыніц, якія не ўпісваюцца ў агульнадзяржаўную статыстыку разглядаемага перыяду, пад агульнай назвай «Сведения о населённых местах, собранные губернскими статистическими комитетами МВД по предписанию Министра внутреннних дел от 9 апреля 1859 года для подготовки издания полного списка населённых мест Российской империи». Тут ёсць звесткі таксама па Віцебскай і Магілёўскай губернях. Іх каштоўнасць заключаецца ў тым, што статыстычныя дадзеныя збіраліся непасрэдна станавымі пріставамі паветаў, а гэта значыць, што адзін чалавек меў справу з невялікай тэрыторыяй. Таму атрыманую інфармацыю можна лічыць дастаткова аб'ектыўнай. Так, статыстычныя табліцы ўтрымліваюць наступныя разделы: «Назва і тып паселішча», «Каму належыць», «Каля якой вады знаходзіцца», «Колькасць двароў», «Колькасць насельніцтва па веравызнаннях». Бачна, што ў аснову табліцы пакладзены той жа прынцып, які выкарыстоўваўся ў адпаведных табліцах Памятных кніжак: падзел насельніцтва па веравызнанні, а не па этнічным паходжанні. Аднак кожная табліца ўтрымлівае рукапісныя пазнакі збіральнікаў пра этнічнае паходжанне насельніцтва насупраць веравызнання. Напрыклад, праваслаўных мужчынскага і жаночага пола Х чалавек, насупраць – допіс: рускі альбо беларус; каталікоў Х чалавек, насупраць – допіс: паляк альбо беларус. Такім чынам, аналізуючы дадзеныя, напрыклад, звесткі па Віцебскай губерні, атрымліваецца, што большасць сялян, дваран, мяшчан-хрысціян, якія тут пражывалі на мяжы 1850–1860-х гг., былі этнічнымі беларусамі, а этнічных палякаў і рускіх быў вельмі нізкі працэнт [5, л. 646; 6, л. 614]. У аснову падзелу на этнічныя групы ў дадзеным выпадку быў пакладзены прынцып, пра які пісаў Каяловіч, а менавіта моўны прынцып.

Каб больш выразна раскрыць праблему этнічнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі насельніцтва Віцебскай і Магілёўскай губерняў напярэдадні і ў час паўстання 1863 г, трэба звярнуцца непасрэдна да ўдзельнікаў узброеннай барацьбы, альбо да так званага «польскага боку». Адным з тых, хто выразна выказаў сваю пазіцыю па пазначанай праблеме, быў кіраўнік паўстанцкіх сіл Літвы і Беларусі Зыгмунт Серакоўскі, які, дарэчы, падтрымліваў сувязі з кіраўнікамі паўстання на Магілёўшчыне, у прыватнасці, з Людвігам Звяждоўскім (да паўстання ўваходзіў у створаную Серакоўскім ваенна-рэвалюцыйную арганізацыю ў Пецярбурзе [7, с. 291]). Свае ідэалагічныя погляды адносна «польскага пытання» Серакоўскі змясціў у «Нататцы пра польскае пытанне», напісанай прыкладна ў снежні 1862 г. У ёй асобна разглядаецца месца і роля Заходняга Края і яго насельніцтва ў будучай барацьбе. Дарэчы, сам З. Серакоўскі не быў этнічным палякам, а паходзіў з украінскага дваранскага роду [7, с. 291]. Так, на пытанне «Што такое Заходні Край?» ён адказвае: «Вышэйшы і сярэдні клас тут складаюць палякі, а дакладней сказаць, літоўцы і русіны (беларусы і украінцы), якія добраахвотна прынялі польскую мову, польскія намаганні, карацей кажучы, польскую цывілізацыю» [8, с. 234]. Далей, паказваючы палітычнае, а не этнічнае значэнне тэрміна «паляк», Серакоўскі адзначае: «Усё, што думае пра пра грамадскія справы, усё, што чытае і піша ў Заходнім Краі, – усё гэта абсалютна польскае» [8, с. 234]. Пагаджаючыся з перавагай этнічных беларусаў, украінцаў, літоўцаў, ён сцвярджае, што ўласна польскі элемент у Краі складае

толькі дзясятую частку насельніцтва. Большасць складалі беларусы, украінцы толькі таму, што размаўлялі па-беларуску і па-ўкраінску. Напрыканцы сваёй высновы З. Серакоўскі яшчэ раз пераходзіць з плоскасці этнічнай у палітычную: «У Заходнім Краі кожны рамеснік, які засвоіў хаця б якую адукацыю, селянін, які зрабіўся заможным, робіцца тут палякам» [8, с. 234]. Зразумела, што такой пазіцыі адносна этнічнай самаідэнтыфікацыі прытрымлівалася большасць буйной і сярэдняй шляхты Віцебскай і Магілёўскай губерняў, што выразна бачна са зместу яе адозваў да расійскага ўрада.

Іншыя погляды на пазначаную праблему мелі прадстаўнікі паўстанцкага руху з асяродку чыноўніцтва і дробнай шляхты. Так, удзельнік аршанскага паўстанцкага атрада на Магілёўшчыне Станіслаў Акрэйц, дзяржаўны служачы Магілёўскай губерні, ва ўспамінах апісвае дыялог з яшчэ адным удзельнікам узброенай барацьбы напярэдадні 1863 г. Між іншым, С. Акрэйц прапанаваў свайму таварышу, таксама дзяржаўнаму служачаму, адказць, навошта той пайшоў у інсурэкцыю (паўстанне)? Той у свім адказе падкрэсліў, што змагацца будзе за Беларусь і за народ [9, с. 59]. З далейшага зместу размовы бачна, што Беларусь (Белоруссия) – гэта краіна паміж Расіяй і Польшчай, дзе жыве народ, які з пункту гледжання культуры больш падобны да польскага. Сам жа тэрмін «народ» мае ў кантэксце адказу два значэнні: з аднаго боку, гэта шляхта, якая змагалася за незалежнасць сваёй радзімы – Польшчы, з другога – гэта маса сялян, за свабоду якіх ішлі змагацца паўстанцы [9, с. 58]. Сярод удзельнікаў узброенага паўстання на Магілёўшчыне С. Акерэйц вылучае невялікую групу «старых земляўласнікаў», якія ішлі супраць народа выключна за аднаўленне Польшчы [9, с. 58].

Яшчэ больш цікавымі і дэмакратычнымі з’яўляюцца погляды іншага ўдзельніка паўстання на Віцебшчыне Арцёма Вярыгі-Дарэўскага. У 1863 г. ён быў адным з арганізатараў рэвалюцыйнага руху ў Віцебску. Свае думкі наконт беларускага пытання Вярыга-Дарэўскі выказваў у прыватнай перапісцы з Адамам Кіркорам на працягу 1859–1862 гг. Тут ён выразна называе сябе беларусам, а ўсю «беларушчыну» лічыць сваім ідэалам [10, с. 242]. Сярод тых, хто падзяляе такія ж погляды, ён называе ўніверсітэцкую моладзь і асабліва бяднейшую маладую шляхту [11, с. 231–232; 243].

Выхаванцы канвікту Гільзэна-Шадурскіх пры Віцебскай гімназіі падзялялі ідэі Вярыгі-Дарэўскага: «З якой жа ўдзячнасцю ўпісваем мы свае імёны ў гэтую кнігу, што злучае нашу Беларусь з Літвой і што належыць мужу, які сёння ззяе ў нашай сям’і, паэту слова і дзеяння. Дарагая Беларусь! Прыгледзься да яго дзейнасці …паглядзі, як ён вучыць тваіх дзяцей любіць радзіму, як вядзе іх дарогай прагрэсу. …Вучыш нас, пане, роднай мове, запальваеш думку …дык няхай табе бог адплаціць, а мы і ўся нашая ўстанова блаславяем тваё імя» [11, с. 267]. Гэтай моладзі супрацьстаяць ветэраны, якія сыходзяць з палітычнай арэны, – старая буйная шляхта.

Такім чынам, выразна бачна, што на пачатку 1860-х гг. у беларускіх губернях сярод этнічных палякаў, «палякаў па духу», з’яўляюцца такія, хто пачалі лічыць сябе хутчэй беларусамі. Гэтае суіснаванне, гэтая трансфармацыя этнічнай самаідэнтыфікацыі ў беларускім тагачасным грамадстве падкрэсліваецца ў той жа перапісцы Вярыгі-Дарэўскага і Кіркора. Апошні, звяртаючыся да Арцёма Дарэўскага, называе яго сынам зямлі беларускай, а сябе залічае да сыноў братняй Беларусі Польшчы, хаця сам паходзіў з небагатага беларускага дваранскага роду Магілёўскай губерніі [11, с. 252; 12, с. 180].

**Заключэнне**

З усяго вышэй сказанага вынікае, што, нягледзячы на адназначнасць урадавай статыстыкі, этнічная карціна насельніцтва Віцебскай і Магілёўскай губерняў 1860-х гг. была вельмі складанай. У гэты час нацыятворчыя працэсы на пазначанай тэрыторыі яшчэ не завершыліся. Большая частка насельніцтва, якая потым прыняла ўдзел ў падзеях 1861–1863 гг., у адносінах да сваёй самаідэнтыфікацыі кіравалася катэгорыямі

хутчэй палітычнымі, чым этнічнымі. Такім чынам, у перыяд рэвалюцыйнага руху 1861–1863 гг. на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў галоўнымі яго ўдзельнікамі былі прадстаўнікі дваранскага саслоўя рыма-каталіцкага веравызнання. Этнічную большасць сярод іх складалі беларусы, якія, ўспрыняўшы польскую мову і культуру, ідэнтыфікавалі сябе як палякі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Коялович, М. О расселении племён Западного края России / М. Коялович. – М. : Тип. Бахметева, 1863. – 36 с.
2. Ратч, В. Сведения о польском мятеже 1863 года в Северо-Западной России : в 2 ч. / В. Ратч. – Вильно : Тип. губерн. правления, 1867. – Ч. 1. – 675 с.
3. Ратч, В. Очерки мятежного движения в Могилёвской губернии в 1863 году / В. Ратч. – Вильно : Тип. А. К. Киркора, 1865. – 68 с.
4. Кайгородов, Д. Из времён польского восстания 1863 года / Д. Кайгородов // Ист. вестн. – 1907. – № 108. – С. 792–802.
5. Сведения о населённых местах Витебской губернии, собранные губернским статистическим комитетом МВД по предписанию министра внутренних дел от 9 апреля 1859 года, для подготовки издания полного списка населённых мест Российской империи. 1866 год. Ч. 1 // Российский государственный исторический архив в г. Москве (РГИА). – Ф. 1290. Оп. 4. Д. 102.
6. Сведения о населённых местах Витебской губернии, собранные губернским статистическим комитетом МВД по предписанию министра внутренних дел от 9 апреля 1859 года, для подготовки издания полного списка населённых мест Российской империи. 1866 год. Ч. 2 // РГИА. – Ф. 1290. Оп. 4. Д. 103.
7. Кісялёў, Г. Серакоўскі Зыгмунд / Г. Кісялёў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1993–2003. – Т. VI, кн. 1 : Пузыны – Усая. – 2001. – С. 291.
8. Русско-польские революционные связи : в 2 т. / под ред. В. А. Дьякова. – М. : Изд-во АН СССР, 1963. – Т. 1 : Материалы и документы. – 583 с.
9. Окрейц, С. Уголок восстания 1863 года / С. Окрейц // Ист. вестн. – 1902. – Т. 90, № 11. – С. 425–453.
10. Пісьмо Арцёма Дарэўскага-Вярыгі да Адама Кіркора ад 13.10. 1862 г. // Пачынальнікі: З гіст.-літ. матэрыялаў XIX ст. / уклад. Г. В. Кісялёў ; рэд. В. В. Барысенка, А. І. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – С. 242–243.
11. Пачынальнікі: З гіст.-літ. матэрыялаў XIX ст. / уклад. Г. В. Кісялёў ; рэд. В. В. Барысенка, А. І. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 549 с.
12. Караў, Д. Кіркор / Д. Караў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1993–2003. – Т. IV : Кадэты – Ляшчэня. –1997. – С. 180.


Рукапіс паступіў у рэдакцыю 11.02.2016

***Hlazyryn S.Ya.*** **Problems of Ethnic Composition of Members of Uprising in 1863 on the Territory of Vitebsk and Mogilyev Provinces**

*The article is devoted to the study of one of the most controversial issues in the problem of the uprising of 1863 in Belarus – the issue of ethnic identification and self-identification of its members. The article analyzes the views on the problem of the main representatives of different ideological trends of the period of the uprising of 1863. The attitude towards the issue of ethnic identity of the participants in the uprising of 1863 in the Vitebsk and Mogilev province is determined.*